Пераемнасць

ВЛКСМ — ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт новаму праекту «100 дзён да 100-годдзя», які прысвечаны векавому юбілею ВЛКСМ.

Можна па-рознаму ставіцца да ідэалаў мінулага: настальгіраваць па іх ці, наадварот, лічыць перажыткам мінулай эпохі, але той факт, што камсамол даў пуцёўку ў жыццё многім маладым людзям і стаў для іх сапраўднай школай жыцця, бясспрэчны.

ВЛКСМ паклаў пачатак маладзёжнаму руху і ў нашай краіне. Яго найлепшыя традыцыі, толькі ў сучасным фармаце, вось ужо амаль 16 гадоў развівае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Новы медыяпраект скіраваны на захаванне пераемнасці пакаленняў і традыцый, фарміраванне ў сучасных юнакоў і дзяўчат цікавасці да вывучэння гісторыі маладзёжнага руху і прадугледжвае правядзенне маштабнай даследчай работы па вывучэнні подзвігаў славутых камсамольцаў, а таксама простых членаў арганізацыі, чые юнацтва і маладосць загартоўваліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, хто сваёй працай уздымаў краіну з руінаў у пасляваенны перыяд, развіваў эканоміку, навуку і культуру, праслаўляў спартыўнымі дасягненнямі.

Беларусы змогуць падзяліцца сямейнымі гісторыямі пра камсамол. Абсалютна кожны можа расказаць пра сябе, сваіх бацькоў і дзядоў, даслаць фотаздымкі і матэрыялы... Цікавасць уяўляе ўсё: знакавыя будоўлі на тэрыторыі Беларусі, маладзёжныя вяселлі, турпаходы і злёты, праца ў будатрадах...

Падчас рэалізацыі медыяпраекта «100 дзён да 100-годдзя» на сайце «Моладзь Беларусі» brsm.by і ў аднайменнай групе

ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» будзе створаны каляндар знакавых падзей маладзёжнага руху.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Вучоба «ў полі»

Валанцёр, да дзіцячага «Еўрабачання» будзь гатоў!

У сталічным Дзіцячым парку імя Максіма Горкага адбыўся валанцёрскі open-air «Мы — каманда!». На сустрэчу пад адкрытым небам Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі запрасіў кандыдатаў у валанцёры на Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2018» і ўдзельнікаў гэтага конкурсу розных гадоў.

Open-air аб'яднаў каля 70 актывістаў Саюза моладзі, многія з якіх мелі добраахвотніцкую практыку на буйнамаштабных міжнародных спартыўных і культурна-забаўляльных мерапрыемствах. Свае пытанні яны маглі задаць Вользе Сацюк, першай беларусцы, якая прадставіла краіну песняй «Танцуй» на дзіцячым «Еўрабачанні» ў 2003 годзе, і валанцёру БРСМ «Добрае Сэрца» Хелене Мерааі — прадстаўніку Беларусі на гэтым папулярным конкурсе ў 2017 годзе.

У праграме мерапрыемства была работа інтэрактыўных пляцовак і інфапункта па прыёме заявак «Я валанцёр!», трэнінгі на камандаўтварэнне, абмен вопытам удзелу ў праектах міжнароднага фармату, танцавальны батл «Мы разам!» і іншае.

Нагадаем, у пачатку ліпеня Саюз моладзі даў старт набору валанцёраў, якія пад эгідай Белтэлерадыёкампаніі ў перыяд з 1 да 27 лістапада будуць задзейнічаны ў рабоце з замежнымі дэлегацыямі, што прыбудуць у Беларусь для ўдзелу ў мерапрыемствах дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2018», а таксама тэхнічнага, творчага персаналу, які займаецца падрыхтоўкай і правядзеннем гэтага маштабнага міжнароднага форуму.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
ЧЫРВОНКА

Крыніца, дай вады напіцца!

Грамадскасць Навагрудка выступіла з ініцыятывай добраўпарадкавання тэрыторыі крыніцы, размешчанай у самым цэнтры горада, у ваколіцах Замкавай гары.

Раённыя арганізацыі БРСМ і «Белай Русі» арганізавалі з гэтай нагоды працоўную акцыю. Актыў грамадскіх аб'яднанняў правёў абкошванне пустазелля навокал, ачысціў саму крыніцу ад камення і галінак. Дзякуючы сумесным намаганням яна набыла новы дагледжаны выгляд. Цяпер жыхарам і гасцям горада будзе зручна набраць вады ў гэтым прыгожым куточку.

— Нашы продкі заўсёды старанна аберагалі крыніцы. Людзі сачылі, каб у ваду не трапляла смецце, упрыгожвалі месцы вакол іх. На жаль, сучаснае жыццё, цэнтральнае водазабеспячэнне прывялі да таго, што некаторыя крыніцы сталі закінутымі і незапатрабаванымі. Апошнім часам для нас жыццёва важнай праблемай з'яўляецца вяртанне да вытокаў, адраджэнне беражлівага стаўлення да розных прыродных аб'ектаў, — кажа **першы сакратар Навагрудскай раённай арганізацыі БРСМ Вольга ШНІГІР.** — У тым ліку і крыніцы неабходныя ўсім нам, каб памятаць продкаў, паважаць традыцыі народа, сваёй малой радзімы. Да таго ж яны свайго кшталту паказчык экалагічнага стану таго месца, у якім знаходзяцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЗАМЕСТ БАСЕЙНА РАШАЮЦЬ ЗАДАЧЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Упершыню Рэспубліканская навукова-даследчая школа прайшла ў 1995 годзе на Віцебшчыне, у пасёлку Лужасна, дзе дзейнічала школа-інтэрнат-гімназія для здольных і адораных дзяцей. Яе ўдзельнікамі тады сталі 65 школьнікаў і 30 педагогаў. Пазней арганізацыя школы перайшла да факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Калі праз колькі гадоў яе ўдзельнікі становяцца нашымі студэнтамі, то ўжо самі дапамагаюць з арганізацыяй чарговай летняй змены для вучняў.

Якія ж якасці павінны быць уласцівыя сапраўднаму вучонаму? Арганізатары школы ўпэўнены, што гэта творчасць і крэатыўнасць, уменне супрацоўнічаць, знаходзіць паразуменне і камандны дух, духоўнасць і інтэлігентнасць. Таму, акрамя адукацыйнага, тут не забываюцца і пра культурны складнік. Напрыклад, ладзяць літаратурныя вечарыны. Вершы гучаць на розных мовах: беларускай, рускай, польскай, французскай, англійскай...

Са школьнікамі працуюць больш як 40 выкладчыкаў з розных універсітэтаў краіны, вучоныя з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, сярод якіх дактары і кандыдаты навук, кіраўнікі беларускіх камандаў на міжнародных алімпіядах, турнірах і канферэнцыях.

Таксама да юных матэматыкаў прыязджаюць выкладчыкі з Расіі, сярод якіх сёлета быў і **доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар базавай кафедры Матэматычнага інстытута імя У. А. Сцяклова РАН Аляксандр БУФЕТАЎ.**

— Я працую з дзецьмі з 1995 года і бачу, што тут, у Беларусі, шмат таленавітых маладых матэматыкаў з вялікім патэнцыялам. Але, на жаль, многія з іх, найчасцей юнакі, арыентаваныя на ІТ-сферу. У пэўнай ступені матэматыка аказваецца «папялушкай» у праграмавання. А мне хочацца даказаць гэтым надзвычай адораным маладым людзям, што яна — таксама перспектыўны кірунак. Для іх самарэалізацыі ў гэтай сферы ёсць усе ўмовы. У «Брыганціне» я чытаю курс па тэорыі мноствaў. Апроч свайго выключна матэматычнага зместу, тэорыя пераклікаецца і з філасофскай праблематыкай. Яна, на жаль, не ўключаецца ў школьную праграму, аднак у багажы ў кожнага матэматыка павінна быць.

Зараз у свеце вельмі актыўна развіваецца STEAM-адукацыя: S — science, T — technology, E — engineering, A — art, M — mathematics (прыродазнаўчыя навукі + тэхналогія + інжынернае мастацтва + творчасць + матэматыка). Выкладчыкі пацвярджаюць, што дзяцей трэба вучыць і выхоўваць комплексна, рыхтаваць адначасова па ўсіх гэтых кірунках. За мяжой такі прадмет, як «science», ёсць у кожнай школе. Ён прысвечаны прыродазнаўчым навукам і арыентаваны на 4-6 класы. Дзяцей не вучаць фізіцы або хіміі, а пачынаюць навучанне з курса, які ўключае матэрыялістычнае разуменне свету.

Падчас летняй школы такі курс праходзяць вучні малодшых класаў. Самаму маленькаму ўдзельніку было ўсяго 6 гадоў. А адзін з самых дарослых і вопытных удзельнікаў Рэспубліканскай школы — Данііл Гомза. Гэтым летам юнак у складзе зборнай Беларусі заваяваў «золата» на Міжнародным турніры юных матэматыкаў у Францыі. Акрамя таго, ён з'яўляецца ўладальнікам дыплома другой ступені гарадской алімпіяды па матэматыцы і дыплома другой ступені заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы. З шостага класа хлопец наведвае «ЮНІ-цэнтр-XXI». Гэта навукова-даследчы і метадычны цэнтр для выкладчыкаў і навучэнцаў, які функцыянуе на базе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ ўжо больш за 20 гадоў. Побач з ім **(на фота)** — яго сяброўка і аднакласніца Аляксандра Новік (абое вучацца ў сталічнай гімназіі № 41), якая прывезла «серабро» з Еўрапейскай матэматычнай алімпіяды сярод дзяўчат. Інтэлектуальнае спаборніцтва праходзіла ў Фларэнцыі (Італія) у красавіку.

«З гэтымі дзецьмі няпроста размаўляць, ім адразу зразумела, што калі два канцы «не вяжуцца», то нічога талковага з гэтага не атрымаецца. Менавіта з такіх навукоўцы і вырастаюць, — усміхаецца Павел Мандрык. — Калі ўдзельнікі летняй школы расстаюцца, то плачуць. Затое потым яшчэ не раз сустракаюцца. Тут знаходзяць сапраўдных сяброў...»

Многія з апошняй змены сустрэнуцца ўжо зусім хутка. У снежні пад эгідай Міністэрства адукацыі адбудзецца XX Рэспубліканскі турнір юных матэматыкаў. У два этапы (у кастрычніку сёлета і ў лютым — сакавіку 2019 года) пройдзе Міжнародны матэматычны турнір гарадоў. Самыя вопытныя будуць прадстаўляць Беларусь вясной наступнага года на міжнародных канферэнцыях маладых навукоўцаў і міжнародных турнірах юных матэматыкаў і фізікаў. Праз год усіх зноў збярэ ўжо XXIV Рэспубліканская летняя навукова-даследчая школа навучэнцаў і настаўнікаў. Падчас цырымоніі закрыцця ўсім удзельнікам дораць футболкі з лагатыпам Рэспубліканскай летняй школы і надпісам «Брыганціна». Пасля юныя даследчыкі з гонарам будуць іх насіць і радаваць нас сваімі дасягненнямі.

Паліна ДАЎГІЛЕНКА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.